## Культурна-масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК “Лунінецкая РЦБС” у лістападзе

У перыяд восеньскіх школьных канікул у бібліятэках былі праведзены розныя мерапрыемствы. Так, **1 лістапада** ў **Мікашэвіцкай г.б.** прайшоў урок дабрыні ”Ісці дарогаю дабра”, **2 лістапада** у **Сінкевіцкай с.б**. адбыўся цыкл сустрэч “Па старонках гісторыі в.Сінкевічы”. У краязнаўчым кутку былі аформлены тэматычныя выставы “Мая радзіма – Беларусь”, “Наш край легендамі багаты”. Для вучняў 5 класа правялі краязнаўчую гадзіну пад час якой дзеці пазнаёміліся з памятнымі датамі і святамі в.Сінкевічы. А **Міжлеская с.б.** правяла пазнавальную гульню-вандроўку “Мая Радзіма – мая Беларусь” і інш.

Прайшлі мерапрыемствы да **Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі.**
**6 лістапада. ЦБ.** Адбылася гадзіна гісторыі “Прошлое всегда с нами”. Прысутныя даведаліся пра гісторыю ўзнікнення свята Кастрычніцкай рэвалюцыі, пра ўплыў і значэнне рэвалюцыі на гісторыю стварэння БССР, пазнаёміліся з кніжнай выставай і паглядзелі відэафільм.

**6 лістапада. ЦДБ.** Прайшла інфармацыйная гадзіна “Эхо революции” для навучэнцаў сярэдняй школы №3 г.Лунінца. Бібліятэкар расказала дзецям пра падзеі мінулага стагоддзя: чаму рабочыя і сяляне актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюцыйных падзеях, як у рэвалюцыі ўдзельнічалі дзеці.

**6 лістапада. Мікашэвіцкая г.б**. Адбыўся гістарычны хранограф “Октябрьская революция. Страницы истории”. На пачатку мерапрыемства бібліятэкар расказала пра найважнейшую падзею прошлага стагоддзя, Вялікую Кастрычніцкую рэвалюцыю. У другой частцы мерапрыемства дзеці адказвалі на пытанні віктарыны “Знаўцы гісторыі” і прымалі ўдзел у літаратурным конкурсе. Напрыканцы мерапрыемства ўдзельнікі падзяліліся сваім бачаннем гэтай грандыёзнай падзеі, расказалі пра фільмы, якія пакінулі наймацнейшае ўраджанне, пра кнігі, якія хацелася перачытаць.

**13 лістапада. ЦДБ.** Супрацоўнікі бібліятэкі наладзілі казачную пастаноўку лялечнага тэатра “Весёлая карусель”. Выхаванцы дзіцячаага садка №8 паглядзелі пастаноўку “В гостях у сказки».

**20 лістапада. ЦБ.** У чытальнай зале бібліятэкі адбыўся творчы вечар “За всё спасибо тебе, осень”, прысвечаны 80-годдзю пісьменніка, паэта, члена літаратурна-паэтычнай студыі “Літаратурная правінцыя” Рыгора Жука. Да гэтага дню сектар маркетынгу, сацыяльнай дзейнасці і метадычнай работы выдаў шосты зборнік Рыгора Андрэевіча “Лебединая песня”, у які вайшлі яго вершы, напісаныя ў розныя гады. На вечары прысутнічалі ўдзельнікі студыі “Літаратурная правінцыя”, журналісты, бібліятэкары і чытачы. *(Лунінецкія навіны. 2024. 22 лістапада. С.12)*

**21 лістапада. ЦБ.** У духоўна-асветніцкім цэнтры “Истоки” цэнтральнай бібліятэкі настаяцель храма Казанскай іконы Божай Маці (в.Рэдзігерава), іерэй

Аляксандр Барысаў правёў гутарку аб святым Архістратыге Міхаіле з вучнямі 5 класа сярэдняй школы №1 горада Лунінца. Ён расказаў школьнікам аб тым, як Святая Праваслаўная Царква святкуе дзень памяці святога Архістратыга Божага Міхаіла. Святар расказаў пра Анёлаў Ахоўнікаў, якіх дае Гасподзь пры Хрышчэнні, растлумачыў якія чыны ёсць анёльскія, чым яны займаюцца, як дапамагаюць людзям.

**22 лістапада. ЦДБ.** Супрацоўнікі цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі правялі для вучняў 4 “А” класа СШ №1 г.Лунінца літаратурную гадзіну “Важный день – день сыновей”, прысвечаную Дню сыноў. Бібліятэкар расказала гісторыю ўзнікнення свята і парэкамендавала кнігі, прысвечаныя гэтаму сямейнаму святу. Дзеці ў сваю чаргу прачыталі прыгожыя вершы.

Да **Міжнароднага дня адмовы ад палення** ў бібліятэках прайшлі акцыі, тэматычныя гутаркі, інфармацыйныя ўрокі, віктарыны і іншыя мерапрыемсты па прапагандзе здаровага ладу жыцця.

**21 лістапада** ў **Рэдзігераўскай сельскай бібліятэцы** прайшла гадзіна трывожнай інфармацыі “Берегись: СПАЙС”. Бібліятэкар расказала адкуль прыйшлі да нас псіхаактыўныя рэчывы, як пагібельна яны уплываюць на арганізм, якія пагрозы нясе ў сабе ароматычны дым, які ўдыхаюць курцы. У **Вулькаўскай-2 сельскай бібліятэцы** прайшла гутарка-дыялог “Жизнь без сигареты”, у **Бастынскай с.б.** і **Люшчанскай бібліятэцы-клубе** прайшла інфармацыйная гадзіна “Дым, уносящий здоровье”, накіраваная на фарміраванне адмоўнага стаўлення да курэння. Усе прысутныя атрымалі буклеты “Аб шкодзе курэння”.

**23 лістапада. Мікашэвіцкая г.б.** У рамках фестываля праваслаўнай культуры “Кладезь” прайшла літаратурна-музычная сустрэча з вядомай беларускай пісьменніцай Таццянай Дашкевіч. Яна расказала аб сабе, сваіх дзецях. Пазнаёміла прысутных са сваімі кнігамі, зачытала вершы і адрыўкі з твораў, выканала свае песні пад гітару і прэзентавала кліп на сваю песню “О конике”, якую выканалі яе дачка і пляменніцы. Таксама пісьменніца падарыла бібліятэцы кнігі пісьменніка Мікалая Шыпілава.

У рамках абласной прафілактычнай акцыі “**Неделя цифровой грамотности**” **з 26 лістапада па 2 снежня** ў бібліятэках прайшлі разнастайныя мерапрыемствы па пытаннях супрацьстаяння пагрозам у сетцы Інтэрнэт.

**29 лістапада. ЦБ**. Адбыўся ўрок інфармацыйнай пісьменнасці «Окно в виртуальный мир”, у Лахвенскай с.б. – урок інфармацыі «Интернет: польза или вред»

**30 лістапада. Мікашэвіцкая г.б.** Адбылася хвіліна бяспекі «Компьютер, дети, безопасность», у **Дварэцкай с.б.** – гутарка са школьнікамі «Безопасный Интернет», у **Бальшачучавіцкай с.б.** – урок бяспекі «Интернет: польза и вред», у **Міжлескай с.б.** – гутарка-дыялог «Чем опасен Интернет?» і інш.

**27 лістапада. ЦБ.** У актавай зале бібліятэкі адбыўся прававы брыфінг “Адарона праў непаўналетніх”, падчас якога была акцэнтавана ўвага на праблему абароны праў дзяцей, іх прававую падтрымку і асвету. У мерапрыемстве прынялі ўдзел намеснік старшыні камісіі па справах непаўналетніх Лунінецкага РВК Вольга Сяргееўна Калугіна, старэйшы памочнік пракурора Вераніка Анатольеўна Чарнавокая і начальнік ІСН Лунінецкага РАУС Вадзім Сяргеевіч Рыбчынскі.